**Волкаў, І.** Возера Івесь і яго радовішча сапрапелю / І. Волкаў // Веснік Глыбоччыны. – 2000. – 13 снеж. – С. 3.

## ВОЗЕРА ІВЕСЬ І ЯГО РАДОВІШЧА САПРАПЕЛЮ

Возера Івесь знаходзіцца ў басейне ракі Шошы каля вёскі Івесь. У тапанімічным слоўніку В. А. Жучкевіча выказана адна версія паходжання назвы возера (стар. 144): назва Івесь паходзіць ад назвы драўніннай пароды лазы – івы, адсюль Івесь. Больш верагодная другая версія: назва паходзіць ад слова «весь», што значыць старадаўняе паселішча людзей. І сапраўды, паблізу ад возера Івесь, на паўднёвым беразе возера Шо знаходзілася пасяленне славянскага племя крывічоў. «Весь» – значыць пасяленне.

Памеры возера Івесь. Плошча люстра вады 0,55 квадратнага кіламетра (55 гектараў), даўжыня 2 кіламетры 120 метраў, найбольшая шырыня 440 метраў, найбольшая глыбіня 26 метраў, сярэдняя 8,7 метра. Аб'ём вады ў возеры 4 мільёны 710 тысяч кубічных метраў, вадазбор з плошчы 12 тысяч 400 квадратных кіламетраў, даўжыня бёрагавой лініі 4 кіламетры 800 метраў.

Катлавіна возера Івесь лагчыннага тыпу, падоўжанай формы, выцягнута з поўначы на поўдзень. Схілы катлавіны спадзістахвалістыя, складзены з пяскоў і супяскоў, пераважна разараныя, на паўднёвым захадзе парослыя лесам. 37 працэнтаў вадазборнай плошчы пад лесам і хмызняком. Схілы вышынёй да 10 метраў, на поўдні да 15 метраў. Берагавая лінія слабазвілістая. Пойма забалочаная, пад хмызняком, дасягае шырыні 200 метраў.

Падводная частка катлавіны возера Івесь складанай будовы, дзеліцца на два плёсы. У паўднёвай частцы знаходзіцца востраў плошчай 1 гектар, тут жа размешчаны дзве ўпадзіны. Паміж паўночна-ўсходнім краем вострава і берагам знаходзіцца пясчаная водмель глыбінёй 1 метр 10 сантыметраў.

Мелкаводдзе займае 20 працэнтаў плошчы возера Івесь. Глыбакаводную зону высцілае крэменязёмісты сапрапель. 74 працэнты азёрнага дна займае Івесьскае радовішча сапрапелю. Запасы яго па вызначэнню вучоных 900 тысяч кубічных метраў. Сярэдняя глыбіня адкладаў сапрапелю 2 метры 40 сантыметраў, найбольшая – 4 метры 50 сантыметраў.

Вось даныя аналізу івесьскіх сапрапеляў, зробленых беларускімі вучонымі ў лабараторных умовах: «У сухім стане сапрапель мае (у працэнтах): азоту 1, вокісу жалеза 3,4, алюмінію 7,7, магнію 2, кальцыю 6,4, калію 2,4, фосфару 0,2. Вадародны паказчык (pH) 7,1». (Энцыклапедыя прыроды Беларусі, том 2-гі, стар. 396).

Вучоныя зрабілі наступны вывад: «Сапрапель у возеры Івесь каштоўны як лекавая гразь, прыдатны на ўгнаенне, для кальматацыі глеб» (там жа). Трэба спадзявацца, што надыдзе час і сапрапель з возера Івесь будзе здабывацца і выкарыстоўвацца як у лячэбных мэтах, так і на ўгнаенне.

У паўночным плёсе возера на значнай плошчы дна пашыраны апясчанены іл.

Вада ў возеры Івесь добра насычана кіслародам, вызначаецца высокай празрыстасцю. Возера Івесь слабапраточнае. У возера ўпадаюць два ручаі: адзін з возера Молена, другі з возера Белае. На захадзе з возера Івесь выцякае рэчка Баярка і ўпадае ў возера Шо.

Непадалёк на беразе возера знаходзіцца жывёлагадоўчая ферма саўгаса «Івесь», якая, на вялікі жаль, нягледзячы на ўсе абвалоўванні і клопаты, забруджвае навакольную прыроду, у тым ліку і возера Івесь, і раку Баярку.

Возера Івесь памалу зарастае. Шырыня паласы расліннасці да 60 метраў, пашырэнне да глыбіні 5-ці з паловай метра.

Возера Івесь багатае рыбай. Тут водзяцца і добра ловяцца ляшчы, шчупакі, акуні, язі, плоткі, ліні, ментузы, ёсць і сорная рыба – уклея і яршы.

***І. І. Волкаў***